***В.В. Сташулёнак***

# З гаворкі вёскі Бабарыкі Мёрскага раёна Віцебскай вобласці

Матэрыялы сабраныя ў 2009 г. студэнткай аддзялення “Беларуская філалогія” БДУ *Сташулёнак Веранікай Віктараўнай*.

Запіс праводзіўся ў в. Бабарыкі, якая знаходзіцца ў Павяцкім сельсавеце Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. У вёсцы 27 двароў, у дадзены момант 15 з іх – жылыя. Жыхары з’яўляюцца беларусамі, але некаторыя называюць сябе палякамі, што звязана са знаходжаннем вёскі да 1939 г. у складзе Польшчы. Ад бліжэйшай чыгуначнай станцыі Друі – 7 км, ад раённага цэнтра Мёр – 25 км, ад абласнога цэнтра Віцебска – каля 170 км.

**Інфарматары:**

1) *Арсоба Яніна Ігнацьеўна,* 1927 г. н., адукацыя 4 кл., нарадзілася ў в. Вята Мёрскага раёна Віцебскай вобл., у в. Бабарыкі пераехала ў 1986 г. – [АЯІ].

2) *Рачыцкая Уладыслава Феліксаўна,* 1931 г. н., адукацыя 4 кл., нарадзілася ў в. Пруднікі Мёрскага раёна Віцебскай вобл., у в. Бабарыкі пераехала ў 1961 г. – [РУФ].

3) *Смулько Рэгіна Антонаўна,* 1937 г. н., адукацыя 4 кл., мясцовая – [СРА].

***Пра вёску Вяту***

Вя́та ж была́ даўне́й у мо́дзе, у Вя́це ду́жа мно́га людзе́й было́, гэ́та во, была́ мястэ́чка, а тады́ вёсэнка, а ціпе́р ужо саўсём нічо́га ня ста́ла ў Вя́це, там тры чалаве́кі, хазя́іны. Я ш там жыла́, як была́ мала́я, у школу во хадзі́ла ў Чамяры́ і да пано́ў во у двор хадзі́ла, ту́така во мы ро́білі, як і рыбя́ты, лёталі… Ну яна́ была́ слы́нная, касцёл быў, ксяндзы́ прыіжджа́лі, гэ́та во, і маладзёжы ду́жа было́ мно́га, збіра́ліся. Гэ́та ішчэ́ пры По́льшчы было́, а по́сьле ста́ла ме́ней, ме́ней. Ста́лі выіжджа́ць, хто ў Да́ўгапільс, хто ў Ры́гу, хто куды́. Дайшло́ да тако́й пары́, што тры хазя́інны асталі́ся то́лькі [АЯІ].

***Пра маладосць***

Тады́ маладзёжы мно́га, ціпе́р ніко́га ш німа́, усе́ маладзёш па гарада́х, а як мы гадава́ліся, мы ш то́ка гадава́ліся, нічо́га ня ві́дзілі, ні зна́лі, а ціпе́р саўсём па-друго́му гаду́юцца. Ціпе́р жыш малы́ ўжо ідзе́ць з гэ́тым, з мабі́льнікам, а мы ні зна́лі э́тага нічо́га. Ну, што ш ты зро́біш, на́ша до́ля така́я. Мы былі́ бе́дныя, мы ня ўчы́ліся нідзе́, шко́лы ш тады́ такі́я, я пры По́льшчы тры гады́ ў шко́лу хадзі́ла, пры Расе́і, як прыйшлі́ ўжо Саве́ты, адзі́н гот хадзі́ла… А я была́ тут нездаро́вая, жылі мы аш у Прушко́ве, у Варша́ве. Мой та́та ўпе́рат пае́хаў, былі́ мы бе́дныя, зямлі́ ў нас было́ ма́ла, пае́хаў та́та мой на за́рабаткі ў Варша́ву, ну ён там і аста́ўся… [АЯІ].

***Пра Замкавую гару***

Цёця, ве́чны пако́й, раска́зывала, што За́мкавая гара́, там э́та высо́кая, там калі́сьці, раска́зывала і́хняя там бабу́ля, там бы́ўшы калі́сьці касьцёл, а тады́ аб’е́хаў. Там бы́ўшы мост, дзе два пагу́ркі там такі́я во, там, ка’ць, быў мост,

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

зато́е там два пагу́ркі, там мост, е́зьдзілі. Так іна́ мне раска́зывала, по́мню… Але́ ж там, ні зна́ю, як капа́лі за́мак, мае́ рыбя́ты ішчо́ во хадзі́лі, знахадзі́лі не́йкія гэ́та жале́скі, прынасі́лі, пака́зывалі, дамо́й не нясьлі́, яны́ бра́лі ў музе́й. Мо́жа, даўне́й там які́я стары́я жы́ўшы каля́ касьцёлу [РУФ].

### *Пра святкаванне Вялікадня*

Сьвянцо́нку зьядзём, тады́ зьбіра́імся ў ха́ту, пе́сьні пяём, падгата́ўліваемся, тады́ вечарко́м ідзём с “альлялю́яй” па ха́тах. У ка́жную ха́ту пія́лі пе́сьні, набе́рым я́ік, усяго́, тады́ дзе́лім, а тады́ та́нцы ро́бім, танцу́йім, пяём, во што ро́білі. Э́та пе́ршы дзень такі́ быў… А на втары́, дзе та́нцы тады́, дзе што. Тады́ ж ужо́ не пайдзе́ш з “алялю́яй”, я́йкі кача́лі, бі́лі ма́льцы, а дзе́ўкі так, пія́лі пе́сьні, сядзе́лі там. Гуля́лі ва ўся́кія гу́льні [РУФ].

### *Пра фарбаванне яек*

Ну, даўне́й жыш цыбу́ляй фарбава́лі я́йкі, кра́сак жыш там не было́, а тады́, як ста́лі кра́скі, ну, кра́скамі фарбава́лі. А ціпе́рыка купля́ім кра́скі. Зва́рым я́йка, а тады́ ж гэ́ну фа́рбу разво́дзім і ло́жым там на пяць міну́т, а тады́ выбіра́ем. Але́ вот яно́ нейк не прыстае́ць кра́ска [СРА].

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)